1. *Березовская, Е.* Международный семинар «Детское чтение: проблемы, поиски, решения» / Е. Березовская // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 19–20.

2. История в лицах и событиях / ред.-сост. О. А. Томашова. – Минск : Красико-Принт, 2014. – 128 с. – (Библиотека предлагает).

3. Каляндар знамянальных і памятных дат: У 2019 годзе спаўняецца // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 24–26.

4. *Паплаўко, В.* Таямнічыя ключы памяці: пазакласнае мерапрыемства для вучняў 6 кл. / В. Паплаўко // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 12–15.

# МУЗЕЙ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ ЛЮБОВІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬГАГА ЎЗРОСТУ

***В. І. Мазалеўскі,***
*старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сённяшні дзень праблема патрыятычнага выхавання дзяцей старэйшага школьнага ўзросту з'яўляецца адной з найбольш важных і актуальных у сучасным грамадстве.

Праблема мадэрнізацыі патрыятычнага выхавання ў сістэме адукацыі звязаны з выяўленнем і захаваннем назапашаных лепшых традыцый у выхаванні падрастаючага пакалення, абнаўленнем яго зместу, праектаваннем новых тэхналогій.

Асноўнай мэтай патрыятычнага выхавання з'яўляецца арыентацыя падрастаючага пакалення на каштоўнасці беларускай культуры, фарміраванне ў яго беражлівых адносін да Радзімы, яе культурна-гістарычнага мінулага. Патрыятызм як шматграннае па сваім змесце паняцце ўключае ў сябе:

– любоў да родных мясцін, павага мінулага сваёй Радзімы, гонар за свой народ;

– павагу да іншых народаў, іх звычаяў і культуры, адсутнасць расавай і нацыянальнай варожасці;

– адчуванне непарыўнасці з навакольным светам, жаданне захаваць, прымножыць багацці сваёй краіны, гатоўнасць быць грамадзянінам, абараняць Айчыну і служыць яе інтарэсам.

Існуе шмат азначэнняў паняцця грамадзянін, якія раскрываюць розныя яго аспекты. Найбольш дакладным з'яўляецца наступнае: «Грамадзянін – асоба, якая належыць да пастаяннага

насельніцтва канкрэтнай дзяржавы, якая карыстаецца ўсімі правамі, забяспечанымі законамі гэтай дзяржавы, і якая выконвае ўсе ўстаноўленыя законамі абавязкі» [4, с. 342].

Грамадзянскае выхаванне, па вызначэнні В. У. Воранава, – гэта «сістэма выхаваўчай работы па фарміраванні якасцяў, неабходных члену дзяржавы, а менавіта: палітычнай культуры, прававой культуры, а таксама патрыятызму і культуры міжнацыянальных адносін» [1, с. 111].

Як бачым, адным з складнікаў грамадзянскага выхавання з'яўляецца патрыятызм, які ў філасофскім слоўніку пад рэд. І. Ц. Фралова пазначаны як «маральны і палітычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, зместам якога з'яўляецца любоў да Бацькаўшчыны, адданасць ёй, гонар за яе мінулае і сучаснасць, імкненне абараняць інтарэсы Радзімы» [5].

Такім чынам, грамадзянскасць і патрыятызм – унутрана ўзаемазвязаныя паняцці, якія абазначаюць якасці асобы, уласцівыя грамадзяніну і патрыёту сваёй Айчыны ў шырокім сэнсе слова.

Большасць даследчыкаў, якія займаюцца вывучэннем патрыятычнага выхавання, адзначаюць наяўнасць ва ўсіх вызначэннях сутнаснага паняцця «патрыятызм» у якасці сэнсаўтворнага кампанента «любоў да Радзімы». Паняцце «Радзіма» з'яўляецца ключавым у сістэме патрыятычнага выхавання. У педагагічнай навуцы яно перажыла пэўныя змены.

Згодна з С. І. Ожагавым, слова «Радзіма» трактуецца як Айчына, родная краіна, месца паходжання каго-небудзь, месца ўзнікнення чаго-небудзь [3, с. 891]. Неабходна адзначыць, што часта паняцце «Радзіма» выкарыстоўваецца як сінонім паняцця «Бацькаўшчына».

У філасофскай, педагагічнай, палітычнай літаратуры склалася іх тоеснасць, хоць многія даследчыкі адзначаюць, што паняцці «Радзіма» і «Бацькаўшчына» маюць адрозненні па змесце і структуры, па характары зменлівасці і ўстойлівасці, па патрыятычным пачуцці да іх.

У слоўніку Ожагава Айчына – гэта «краіна, дзе нарадзіўся дадзены чалавек і грамадзянінам якой ён з'яўляецца» [3, с. 603].

Паводле слоўніка У. І. Даля, «Айчына – родная зямля, дзе чалавек вырас; да якой чалавек належыць па нараджэнні, мове і веры; Радзіма ў шырокім сэнсе» [2, с. 444].

Музеі з'яўляюцца захавальнікамі чалавечай памяці. Як інстытуты культуры яны збіраюць, захоўваюць, вывучаюць і прапагандуюць гісторыка-культурную спадчыну, далучаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

людзей да прадметнага свету культуры. Для сучаснага музея характэрным з'яўляецца ўзрастанне культурна-адукацыйнай дзейнасці, у іх фармуецца адукацыйная канцэпцыя, якая грунтуецца на дыялогавых формах зносін з аўдыторыяй.

Сучасны музей з'яўляецца адной з форм работы па развіцці творчай самадзейнасці і грамадскай актыўнасці дзяцей старэйшага школьнага ўзросту і мае выхаваўчую і навукова-пазнавальную каштоўнасць. Ён збірае інфармацыю аб мінулай і сучаснай культуры грамадства, што спрыяе фармаванню самасвядомасці падрастаючага пакалення. Дзякуючы гэтаму чалавек атрымлівае магчымасць арыентавацца ў гістарычнай і культурнай прасторы. Падарожнічаючы па родным краі, вывучаючы помнікі гісторыі і культуры, удзельнічаючы ў пошукавай працы, сустракаючыся з цікавымі людзьмі, падлеткі даведаюцца аб гісторыі роднага краю знутры, разумеюць, як шмат сіл і душы ўклалі іх продкі ў культуру і эканоміку роднага краю, часткай якога з'яўляецца сям'я і школа. Гэта выхоўвае павагу да памяці мінулых пакаленняў, беражлівыя адносіны да культурнай і прыроднай спадчыны, без чаго нельга выхаваць патрыятызм і любоў да сваёй Бацькаўшчыны і малой Радзімы.

Сучасны музей дае магчымасць дзецям старэйшага школьнага ўзросту паспрабаваць свае сілы ў розных відах навуковай, тэхнічнай і грамадскай дзейнасці. Дзеці атрымліваюць практычныя навыкі пошукавай працы, уменне апісваць і класіфікаваць гістарычныя крыніцы, працаваць з гістарычнымі дакументамі.

Музей – гэта складаны арганізм. Яго жыццяздольнасць цалкам залежыць ад зладжанай працы ўсяго калектыву музейных супрацоўнікаў. Такім чынам, стварэнне і праца сучаснага музея – гэта не проста збіральніцтва, а мэтанакіраваная праца, якая нясе ў сабе велізарны выхаваўчы і адукацыйны патэнцыял.

Улічваючы дадзеныя тэарэтычныя пазіцыі, можна зрабіць выснову аб тым, што патрыятычнае выхаванне, як і выхаванне наогул, павінна грунтавацца на веданні тых кампанентаў быцця, культуры, якія фарміруюць ў цэлым уяўленне падлетка аб Радзіме, яе культурна-гістарычных традыцыях, дасягненнях і каштоўнасцях, лепшых яе прадстаўніках. Вырашэнню гэтай задачы павінны служыць музеі, дзейнасць якіх накіравана на фарміраванне сацыяльна-актыўнай пазіцыі, асабісты ўдзел, пошук і разуменне сацыяльнага і духоўнага пачаткаў сваёй малой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Радзімы, народа. Важнае месца ў вырашэнні гэтай задачы займае непасрэдны кантакт выхаванца з гістарычнымі матэрыяламі, элементамі культуры, які ажыццяўляецца ва ўмовах сучаснага музея.

Можна гаварыць аб музеі адначасова не толькі як пра форму арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці (уключэнне дзяцей старэйшага школьнага ўзросту ў пошукавую, краязнаўчую працу на базе музея), але і як аб сродку патрыятычнага выхавання.

Музей валодае велізарным адукацыйна-выхаваўчым патэнцыялам, так як ён захоўвае і экспануе сапраўдныя гістарычныя дакументы. Эфектыўнае выкарыстанне гэтага патэнцыялу для выхавання навучэнцаў у духу высокай маральнасці, патрыятызму, грамадзянскай самасвядомасці з'яўляецца адной з найважнейшых задач школьнага музея. Удзел дзяцей у пошукавай працы, вывучэнні і апісанні музейных прадметаў, стварэнні экспазіцыі, правядзенні экскурсій, вечароў, канферэнцый спрыяе запаўненню іх вольнага часу. У працэсе даследчай дзейнасці дзеці старэйшага школьнага ўзросту авалодваюць рознымі прыёмамі і навыкамі краязнаўчай і музейнай прафесійнай дзейнасці, а ў ходзе краязнаўчых пошукаў – асновамі многіх навуковых дысцыплін, якія не прадугледжаны школьнай праграмай.

Выхаванне патрыятычных пачуццяў дзяцей старэйшага школьнага ўзросту – адна з педагагічных задач, якая ўключае ў сябе выхаванне любові да блізкіх людзей, да школы, да роднай хаты, да роднай вуліцы, да роднага горада ці вёскі, да роднай краіны – Рэспублікі Беларусь.

---

1. *Воронов, В. В.* Гражданское воспитание молодежи / Педагогика : учебник / Л. П. Крившенко [и др.] ; под ред. Л. П. Крившенко. – М. : ТК Велби, Изд-во Проспект, 2007. – 432 с.

2. *Даль, В. И.* Толковый словарь русского языка / В. И. Даль. – М. : Эксмо, 2011. – 735 с.

3. *Ожегов, С. И.* Словарь русского языка / С. И. Ожегов. – М. : ОНИКС, 2006. – 1199 с.

4. Словарь русского языка : в 4 т. – Т. 1 ; под ред. А. П. Евгеньевой. – 2-е изд., испр., 1981. – 698 с.

5. Философский словарь / под ред. И. Т. Фролова. – М., 1991.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ